Мінск, 24 сакавіка 2017 года

Ваша Экселенцыя,

Карыстаюся гэтай святочнай нагодай, каб даслаць Вам шчырыя віншаванні з 25-годдзем дыпламатычных адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Каралеўствам Нідэрландаў.

За чвэрць стагоддзя мы здолелі закласці трывалую аснову для плённага ўзаемадзеяння паміж нашымі краінамі. Дынамічна развіваецца гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва, ажыццяўляюцца неабходныя крокі для актывізацыі палітычнага дыялогу, падтрымліваюцца пабрацімскія сувязі. У нашай краіне высока цэняць працу дабрачынных арганізацый Нідэрландаў па аздараўленні дзяцей і дастаўцы гуманітарнай дапамогі ў раёны Беларусі, якія пацярпелі ад наступстваў Чарнобыльскай катастрофы.

Упэўнены, што больш поўнае выкарыстанне існуючага патэнцыялу беларуска-нідэрландскіх адносін цалкам адпавядае ўзаемным інтарэсам і будзе спрыяць умацаванню стабільнасці і бяспекі ў Еўропе.

Прыміце, Ваша Экселенцыя, пажаданні моцнага здароўя і поспехаў у адказнай дзяржаўнай дзейнасці, а таксама запэўненне ў маёй вельмі высокай павазе.

Уладзімір Макей